# 5. ОПРЕДЕЛЕНИЕ СОЦИАЛЬНОЙ РОЛИ, ЗАКОНОМЕРНОСТЕЙ ФУНКЦИОНИРОВАНИЯ ЯЗЫКОВ, ЛИТЕРАТУР, ФОЛЬКЛОРА БЕЛАРУСИ В КОНТЕКСТЕ РАЗВИТИЯ ЕВРОПЕЙСКОЙ И МИРОВОЙ КУЛЬТУР

## СПЕЦЫФІКА ВОБРАЗНАЙ СІСТЭМЫ Ў ЛІРЫЦЫ ВІКІ ТРЭНАС

***Анцімонік А.В.***
*студэнтка 2 курса ГДУ імя Ф. Скарыны, г. Гомель, Рэспубліка Беларусь*
*Навуковы кіраўнік – Аммон М.У., канд. філал. навук*

Сучасная беларуская паэзія развівае суб’ектыўнасць ў рэчышчы складанага спалучэння традыцыйнай, мадэрніцкай і постмадэрніцкай канцэпцый. Пры гэтым ўсталяванню неабходнага даверу паміж аўтарам і чытачом часта садзейнічае мастацкая спавядальная шчырасць, што нярэдка дасягаецца праз стварэнне складана-індывідуальнай сістэмы вобразаў-сімвалаў.

**Вынікі і іх абмеркаванне.** Паказальнай у дадзеным плане з’яўляецца лірыка Вікі Трэнас. Так, звяртаючыся да першага зборніка Вікі Трэнас “Цуд канфіскаванага дзяцінства”, варта спыніць увагу на такіх паняццях, як “снег”, “вясна”, “сон”, “вочы”, “сонца”, што праходзяць наскрозь у кнізе. Снег у Трэнас, часта крывавы і хуткаталы, уяўляецца самастойнай істотай (“снег чырвонаю здрадай цалуе брудны асфальт” [1], “ізноў на далонях маіх заспявае снег” [1]). Як бы насуперак яму ў прасторы зборніка паўстае вясна (“я бегла па вясне, і плакаў боль” [1], “Паэтка на вясну глядзіць праз шкло” [1]), якая відавочна больш нежаданы “персанаж” для лірычнай гераіні, чым родная белая зімовая дэкарацыя. Не абышлося і без вобраза сонца, у дачыненні да якога ў аўтаркі хапае выкшталцоных спалучэнняў (“усё роўна пачварнае сонца немаўлятка маё прапаліла” [1], “сонца тваё падобнае на манету / маё – на канцэнтрацыю крывавых кропель” [1]).

Значная роля ў “Цудзе…” належыць семантыцы вачэй. У зборніку, верагодна, завуаліравана знакамітае “вочы – люстэрка душы” (“Няма нічога. / Ёсьць толькі колер тваіх вачэй” [1], “і за Нішто ў вачах чужых ізноў загіну” [1], “нечы сум пазірае тваімі вачыма” [1]). Наконт наступнага вобраза – сну – трапна сказала Ю. Новік: “Нібыта лірычная гераіня шукае шлях для адступленьня і хоча ўсьведаміць аднойчы, што гэта толькі сон, прыгожы, новы, чароўны, балесны” [2]. Пошук выйсця адыгрывае не апошнюю ролю ў характарыстыцы лірычнай гераіні (“я буду Іудам у наступным жыццёвым сне” [1], “Зусім не балючы летаргічны сон у лядоўні” [1]).

У зборніку паэткі “Экзістэнцыйны пейзаж” дамінуючае месца займаюць паняцці “мора”, “адлегласць”, “смак”, “горад” (хаця і снег па-ранейшаму застаецца ў полі зроку лірычнай гераіні (“я – дзіўны боль / той боль пад першым снегам” [3, с. 12], “я збіраю сняжынкі ў кішэнях і мару пра снег” [3, с. 33], “у жніўня сэрца разарве і пойдзе снег” [3, с. 35])). Семантыка мора (вады ўвогуле) можа сведчыць пра неаднастайнасць душэўнага стану лірычнага суб’екта, зменлівасць яго настрою і свавольніцтва (“буду рэчкай, якая цячэ назад” [3, с. 3], “і ў душы якой – бурлівасць горнага вадаспаду” [3, с. 58]). Акрамя гэтага, праз дадзены вобраз суб’ект лірыкі знаходзіць сувязь з аб’ектам свайго кахання (“а цяпер мы на беразе мора, і пахне вясною” [3, с. 50], “і толькі я – лішняя, бо ты – мора / а я – / рыбіна / выкінутая / на / бераг” [3, с. 71]). Адлегласць жа гераіня ўпарта стараецца пераадолець праз словы і выказаны боль (“забіваю самотай адлегласць” [3, с. 25], “Хваля словамі ў сшытак легла, / Мне ёсць чым вымяраць адлегласць” [3, с. 54], ” лічу адлегласці / не кіламетрамі, а болем” [3, с. 21]). Горад – абмежаваная прастора ў Трэнас, што, як правіла, не мае назвы; гэта месца (і канкрэтнае, і абстрактнае), якое сведчыць пра пэўныя граніцы, адданасць зямному (“Мой горад – адзіны, каму я веру” [3, с. 17], “шэры горад, галодны на цішу, мяне праглыне” [3, с. 33], “я нашу ў сабе сонечны горад” [3, с. 42]). Між іншым, зборнік насычаны назвамі месяцаў, што падкрэслівае пэўны час і адпаведны настрой. У прыватнасці, менавіта зімовыя месяцы лірычная гераіня атаясамлівае з сабой, нярэдка ў супрацьпастаўленні з цёплымі перыядамі года (“Ты – жарсны жнівень, я – трывожны снежань” [3, с. 68], “у жніўня сэрца разарве і пойдзе снег / ён упадзе са мною ў чэзлую траву” [3, с. 35]).

**Заключэнне.** Такім чынам, у творчасці Вікі Трэнас пераважае арыгінальнае вырашэнне рэалізацыі звыклых вобразаў, што праяўляецца праз высакаякасныя мастацкія спалучэнні і інтуітыўна-філасафічную сэнсавую напоўненасць падабраных слоў.

Літаратура:

1. Трэнас, В. Цуд канфіскаванага дзяцінства / В. Трэнас. – Мінск: Логвінаў, 2005. – 21 с.
2. Новік, Ю. Адназначна смачна. Нататкі пра кнігу Вікі Трэнас «Экзістэнцыйны пейзаж» / Ю. Новік. – Рэжым доступу: http://rv-blr.com/litaratura/view/1922. – Дата доступу: 21.01.2014.
3. Трэнас, В. Экзістэнцыйны пейзаж / В. Трэнас. – Мінск: Галіяфы, 2008. – 84 с.
4. Шаўлякова, І. Сапраўдныя хронікі Поўні / І. Шаўлякова. – Мінск: Літаратура і Мастацтва, 2011. – 184 с.